**Быць непрыгожай – добра ці дрэнна?**
**Урок-разважанне па апавяданні «Галка» Валерыя Гапеева**
**(для вучняў 9-11 класаў)**

**М. А. Шыцёнак,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
СШ № 2 г. Полацка

Урок пазакласнага чытання прапаную правесці па апавяданні Валерыя Гапеева «Галка». Твор невялікага памеру, таму вучні яго прачытаюць да ўрока. Апавяданне цікавае для маладога пакалення, таму што раскрываюцца ўзаемаадносіны паміж дзяўчынай і хлопцам. Вучні могуць абаперціся на ўласны вопыт або засцерагчыся ад памылак. Актуальны на сённяшні дзень момант – зносіны паміж падлеткамі з сям'яў рознага дастатку. У школе вучацца дзеці, якіх таксама выхоўваюць бабулі, а бацькі жывуць дзеля сябе. Калі вучняў зацікавіць апавяданне «Галка», то яны прачытаюць і іншыя творы Валерыя Гапеева.

Дзеці актыўна абмяркоўвалі твор. Яны лічаць, што чалавек павінен быць не столькі знешне прыгожым, колькі сваім унутраным светам, учынкамі.

На практыцы ўпэўнілася, што гэты твор не пакідае дзяцей абыякавымі і раўнадушнымі, прымушае задумацца і над сваімі словамі і ўчынкамі.

**Мэты ўрока:** стварэнне ўмоў для эмацыянальнага ўспрыняцця тэксту; развіццё ўменняў аналізаваць твор і рабіць вывады; садзейнічаць маральнаму і эстэтычнаму выхаванню асобы; прывіваць цікавасць да чытання сучасных аўтараў праз знаёмства з творчасцю Валерыя Гапеева.

**Задачы:** узнавіць змест твора; даць характарыстыку героям; выказваць сваё разуменне паняцця прыгажосць; вызначыць ідэйную накіраванасць твора; даць парады галоўным героям; працягнуць знаёмства з творчасцю аўтара.

**Т ы п  у р о к а:** вывучэнне новага матэрыялу.

**А б с т а л я в а н н е:** тэкст апавядання «Галка» Валерыя Гапеева; музычны запіс паланэза Агінскага «Развітанне з Радзімай»; тлумачальны слоўнік.

**Х о д  у р о к а**

I. **Арганізацыйны момант**

II. **Падрыхтоўка да ўспрыняцця твора**

***Гучыць паланэз Агінскага «Развітанне з Радзімай».***

**Настаўнік.** Скажыце, сёння прыгожы дзень? А ці прыгожая музыка гучыць зараз? А чаму менавіта гэтую мелодыю я прапанавала вам паслухаць сёння на ўроку? *(Адказы вучняў.)* Як вы думаеце, лягчэй у жыцці прыгожаму або непрыгожаму чалавеку? *(Адказы вучняў.)*

**III. Паведамленне тэмы і  пастаноўка задач урока**

**Настаўнік.** Тэма нашага сённяшняга ўрока «**Быць непрыгожай – добра ці дрэнна?**». Скажыце, калі ласка, якія задачы мы павінны вырашыць на сённяшнім уроку? Запісы на дошцы дапамогуць вам гэта зрабіць.

- ✓ Узнавіць…
- ✓ Даць характарыстыку…
- ✓ … прыгажосць.
- ✓ Вызначыць… твора.
- ✓ Даць парады…
- ✓ Працягнуць знаёмства…

Запішыце дату і тэму нашага ўрока ў сшыткі.

**IV. Праца над зместам твора**

***Праверка ведання вучнямі зместу твора.***

*Віктарына «Так» ці «не».* Запішыце, калі ласка, у сшытках нумар пытання і адказ – так ці не.

1. Галка жыла з бабуляй?
2. Вечарамі бабуля вучыла ўнучку танцаваць.
3. У клубе ды на школьных вечарах Галка стаяла каля магнітафона і не танцавала?
4. Бабуля часта на Галку сварылася?
5. Андрэрэй запрасіў Галку на танга?
6. На наступнай дыскатэцы Галка хацела запрасіць Андрэя на белы танец, але не рашылася гэта зрабіць?

***Узаемаправерка.*** *Вучні абменьваюцца сшыткамі і правяраюць выкананае заданне з дапамогай ключа з адказамі, змешчанага на дошцы на дошцы*:

1. Так. 2. Так. 3. Так. 4. Не. 5. Не. 6. Не.

**Настаўнік.** У пачатку ўрока вы давалі адказ на пытанне «Быць прыгожай – добра ці дрэнна?». А які адказ на яго дае наша гераіня Галка? *(Быць непрыгожай не так ужо і дрэнна.)* Чаму яна так думае?

Зачытайце апісанне нашай гераіні. *( Галя нерыгожая, так усе  лічаць. ...)*

Ці сапраўды дзяўчына такая непрыгожая? Што прымушае яе так думаць? *(Адносіны людзей; у бабулі маленькая пенсія і зарплата, таму няма грошай модна апранацца; ёй зручна быць незаўважнай; няма каму пераканаць яе ў тым, што яна прыгожая…)*

Чаму Галя сціпла апраналася і валасы ў клубок звязвала? *(Маці за косы цягала.)* А хіба гэта не спрыяла таму, што Галя хавае сваю прыгажосць?

«Вочы амаль чорныя ў тонкім паўкружжы брывоў. То Галя іх не надта паказвае». Чаму?

Скажыце, Галка – гэта… *(Мянушка.)* Як дзяўчына адносіцца да сваёй мянушкі? *(Галка быццам і прыгожа, але з пагардай.)* Чаму з пагардай? Ці спрабуе дзяўчына супрацьстаяць гэтаму?

А ці ёсць хоць хто-небудзь, хто лічыць Галку прыгожай?

Андрэй вачамі Галі. Які ён? Знайдзіце і зачытайце апісанне хлопца. *(Высокі, прыгожы, паводзіць сябе зусім не так, як вясковыя хлопцы; разумны і самастойны не па гадах.)* Ці быў Андрэй такім на самой справе?

«Галю кіпнем абдало…». Як вы разумееце гэтыя словы? Што здарылася з дзяўчынай?

Калі Галя стала сабе брыдкай? Зачытайце гэты эпізод. *(Стала горача і невыносна сорамна, што стаіць басаног, з драпінамі на каленях, з выпацканымі ў зелень рукамі (рвала малачай), у старой сукенцы і яшчэ з Варкай…)* Чаму так адбылося?

**Фізкультхвілінка**

**Настаўнік.** Кожны чалавек хоча быць прыгожым. А што як не прыгожая ўсмешка робіць чалавека прыгажэйшым. Усміхніцеся, калі ласка, а цяпер усміхніцеся сваім суседзям. А яшчэ чалавека ўпрыгожваюць добрыя думкі і словы. Зрабіце, калі ласка, адзін аднаму камплімент.

Дзякую вам за добрыя словы. Спадзяюся, што вы крыху адпачылі, а зараз працягваем працаваць.

«О, які гэта быў цуд!.. на яе твары ззяла ўсмешка шчасця, а ў куточках вачэй паблісквалі кропелькі слёз…». Калі і чаму Галя адчула сябе шчаслівай?

Зачытайце апісанне Галі, калі яна збіралася ў клуб на танцы. *(Бабуля сушаных рамонкаў у вялікі чыгун кінула, кіпнем заліла. Потым у гэтай пахучай вадзе Галя мыла свае чорныя валасы. Калі яны высахлі і бабуля расчасала іх, то і сама Галя ахнула: такой лёгкай аксамітнай хваляй сцякалі яны з галавы далёка на плечы! А як яны пасавалі да бліскучай блакітнай сукенкі! А чорныя туфелькі на абцасіках! Галя ўсё круцілася перад старым люстэркам і ціхенька смяялася сама з сябе. Якая яна ...прыгожая!)*

Скажыце, няўжо распушчаныя валасы і новая сукенка робяць дзяўчыну прыгожай? *(Упэўненасць у сабе і сваёй прыгажосці.)*

Што такое прыгажосць? Запішыце ў сшытак, як вы разумееце значэнне гэтага слова або свае асацыяцыі. *(Адказы вучняў.)* Дапоўніце свае запісы адказамі аднакласнікаў.

Давайце звернемся да тлумачальнага слоўніка. Як там падаецца значэнне слова *прыгажосць?*

Прыгажосць. 1. Уласцівасць прыгожага. 2. Што-небудзь прыгожае, чароўнае; хараство. 3.Прыгожы знешні выгляд. 4. Прыгажуня.

- ✓ Якой бывае прыгажосць? *(Знешняя і ўнутраная.)*
- ✓ Хто з герояў сапраўды прыгожы? Чаму?
- ✓ Здзіўленне; захапленне; спалох; пошук выйсця; упэўнены спакой; чаканне. Калі такія пачуцці перапаўнялі нашу гераіню?
- ✓ «Я разумею…» – сказала дзяўчына. Што яна разумее?
- ✓ Патлумачце фразу: «Помсцяць за тое, што яна больш не згадзілася быць непрыгожай…». Чаму?

**V. Падагульненне**

**Настаўнік.** Ці змянілася ваша меркаванне за ўрок: быць непрыгожай – добра або дрэнна? Якія маральныя праблемы ўздымае аўтар у творы? Што хацеў данесці да нас Валерый Гапееў? Ці зацікавіла вас творчасць гэтага сучаснага пісьменніка? Ці параілі б вы сваім сябрам прачытаць апавяданне «Галка»?

*Заслухоўваюцца меркаванні вучняў.*

**VI. Рэфлексія**

**Настаўнік.** Хлопцы, дайце, калі ласка, парады Андрэю, а дзяўчаты – Галцы, як ім трэба весці сябе далей. Дапішыце ў табліцу тыя парады аднакласнікаў, якія вам спадабаюцца.

*Заслухоўваюцца адказы вучняў і запаўняецца прапанаваная табліца.*

Парады

| Галцы | Андрэю |
|---|---|
| | |

**Настаўнік.** Скажыце, як складзецца далейшы лёс Галкі? Заўтра яна будзе прыгожай ці непрыгожай?

Пераканайце дзяўчыну, што яна прыгожая і ёй трэба заставацца такой.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак**

**VIII. Дамашняе заданне**

У дадатковых крыніцах адшукайце інфармацыю пра Валерыя Гапеева і запішыце ў сшыткі 4 найбольш цікавыя факты. Твор заканчваецца радкамі:

«Бабуля яе папярэджвала». Дайце, калі ласка, пісьмовы адказ, аб чым, на вашу думку, папярэждвала ўнучку бабуля.